■ Спорт-тайм

# МЕДАЛІ, ЛІЦЭНЗІІ І ПЕРАМОГІ

**Вікторыя гандбольнага СКА над аўстрыйскім «Хардам» выводзіць армейцаў у групавы этап Кубка ЕГФ, беларускія цяжкаатлеты заваёўваюць максімальную колькасць алімпійскіх ліцэнзій, а батутысты вяртаюцца дадому з шасцю медалямі чэмпіянату свету. Самыя актуальныя спартыўныя падзеі — у штотыднёвым аглядзе «Звязды».**

**1.** ***Біятлонны Кубак свету стартаваў у шведскім Эстэрсундзе, у нядзелю яго адкрылі супермікст і змяшаная эстафета.*** У першым відзе праграмы нашу краіну прадставіў дуэт Надзеі Пісаравай і Юрыя Лядава. Каманда выкарыстала 16 дадатковых патронаў, атрымала адзін штрафны круг і заняла толькі 19 месца. Куды лепш выглядае вынік беларусаў у змяшанай эстафеце, за Беларусь там беглі — Надзея Скардзіна, Ірына Крыўко, Дзмітрый Дзюжаў і Уладзімір Чапелін. Наша каманда прайшла па дыстанцыі больш стабільна і заняла 7 месца.

Нагадаем, першы этап Кубка свету ў Эстэрсундзе працягнецца 2 снежня мужчынскай індывідуальнай гонкай, а 3 снежня індывідуальную гонку правядуць жанчыны.

**2.** ***Мінскі гандбольны СКА паўторна ўзяў верх над аўстрыйскім «Хардам» (35:23) і выйшаў у групавы раўнд Кубка ЕГФ.*** Армейцы ўпэўнена лідзіравалі на працягу ўсяго матча, што дазволіла ім давесці сустрэчу да перамогі. Самым выніковым у складзе беларускага клуба стаў Арцём Каралёк, на яго рахунку 8 набраных ачкоў. Добра адгуляў і варатар СКА Вячаслаў Салдаценка.



*— Мы выйгралі першы матч з розніцай у 10 мячоў і мелі вялікую праблему, каб прымусіць каманду весці сваю гульню. Шчыра кажучы, нам не ўдалося гэтага зрабіць на сто працэнтаў. Мы мелі шмат памылак. Тым не менш вынікам задаволены. З кім хацелася б згуляць у групе? Каго Бог пашле, з тымі і згуляем. У любой каманды можна выйграць, як і прайграць. Чым складанейшыя матчы, тым больш карысці для нас,* — адзначыў **галоўны трэнер армейцаў Спартак МІРАНОВІЧ.**

У групавым раўндзе возьмуць удзел 16 каманд. Пры лёсаванні ўдзельнікі будуць размеркаваны па чатырох кошыках. Сапернікаў СКА даведаемся ў чацвер, 3 снежня, лёсаванне пройдзе ў Вене і пачнецца ў 13.00 па беларускім часе.

**3.** ***Зборная Беларусі па цяжкай атлетыцы атрымала максімум алімпійскіх ліцэнзій на чэмпіянаце свету, які завяршыўся ў амерыканскім Х'юстане.*** Наша каманда ў Бразіліі можа быць прадстаўлена шасцю мужчынамі і чатырма жанчынамі.

Па выніках сусветнага форуму ў агульнакамандным заліку па заваяваных узнагародах беларусы занялі 8-е месца, якое забяспечыў залаты медаль у суме дваябор'я ў катэгорыі да 94 кг Вадзіма Стральцова. Выйгралі медальны залік у Х'юстане прадстаўнікі Кітая, у якіх у скарбонцы 6 залатых і 4 сярэбраныя ўзнагароды.

**4.** ***Тры алімпійскія ліцэнзіі з чатырох магчымых і шэсць медалёў — вынік выступлення беларускай каманды на чэмпіянаце свету па скачках на батуце.***

У заключны дзень турніру беларус Уладзіслаў Ганчароў стаў сярэбраным прызёрам, а Тацяна Пятрэня — уладальніцай бронзавай узнагароды ў фінальных спаборніцтвах па скачках на батуце.

Уладзіслаў Ганчароў, Тацяна Пятрэня і Ганна Гарчанок таксама сталі ўладальнікамі ліцэнзій на ўдзел у Алімпійскіх гульнях 2016 года ў Рыа-дэ-Жанейра. У сінхронных скачках другое месца занялі Мікалай Казак і Уладзіслаў Ганчароў. Раней на сусветным форуме ў Адэнсе жаночая зборная Беларусі заваявала сярэбраныя ўзнагароды ў камандным першынстве, мужчынская атрымала бронзавыя медалі. Такім чынам, у агульнакамандным заліку зборная Беларусі заняла 5-е месца.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.04 | 16.52 | 7.48 |
| Віцебск — | 9.00 | 16.35 | 7.35 |
| Магілёў — | 8.54 | 16.42 | 7.48 |
| Гомель — | 8.43 | 16.47 | 8.04 |
| Гродна — | 9.18 | 17.09 | 7.51 |
| Брэст — | 9.11 | 17.17 | 8.06 |

### Месяц

*Апошняя квадра 3 снежня. Месяц у сузор'і Вадалея.*

### Імяніны

*Пр. Мікалая, Платона, Рамана. К. Наталлі.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 1 СНЕЖНЯ

**1890** год — 115 гадоў таму нарадзіўся Васіль Канстанцінавіч Блюхер, савецкі ваенны дзеяч, адзін з першых пяці маршалаў Савецкага Саюза (1935). У пачатку 1-й сусветнай вайны пайшоў на фронт радавым, за баявыя подзвігі ўзнагароджаны двума Георгіеўскімі крыжамі. На пачатку Кастрычніцкай рэвалюцыі — член Самарскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, удзельнічаў ва ўстанаўленні савецкай улады, змагаўся супраць войскаў Калчака. У 1921-1922 гг. — ваенны міністр, галоўнакамандуючы і член Ваеннага савета Народна-рэвалюцыйнай арміі Далёкаўсходняй народнай рэспублікі, кіраваў рэарганізацыяй арміі, разгромам белагвардзейцаў пад Валачаеўкай, узяццем Спаска ў 1922 годзе. Затым камандаваў войскамі Асобай Чырванасцяжнай далёкаўсходняй арміі, кіраваў разгромам кітайскіх мілітарыстаў падчас савецка-кітайскага канфлікту на КВЖД у 1929 г. і стварэннем абароны на Далёкім Усходзе. Улетку 1938-га, у перыяд разгрому японскіх мілітарыстаў на возеры Хасан, камандаваў Далёкаўсходнім фронтам. У восені 1936 года ў НКУС СССР на Блюхера пачалі паступаць агентурныя звесткі аб удзеле ў змове, якія паведамлялі, у тым ліку, аб намеры маршала дамагчыся аддзялення Далёкага Усходу ад СССР. 22 кастрычніка 1938 года В.К. Блюхер быў арыштаваны. За сямнаццаць дзён знаходжання Блюхера ва ўнутранай турме НКУС яго дапытвалі дваццаць адзін раз. Сем допытаў арыштаванага правёў асабіста Берыя. 9 лістапада 1938 года маршал раптоўна сканаў у кабінеце ўрача ўнутранай турмы, не вытрымаўшы пабояў і здзекаў. Быў рэабілітаваны ў 1956 годзе.



**1922** год — нарадзіўся Усевалад Баброў, выдатны савецкі футбаліст і хакеіст, трэнер, алімпійскі чэмпіён. У перыяд 1947—1953 гадоў Баброў сумяшчаў свае выступленні ў футболе з хакеем. На яго рахунку нямала выдатных галоў. У чэмпіянатах СССР па футболе ён забіў 97 галоў у 116 матчах. Усевалад Міхайлавіч быў адзіным у гісторыі спорту ўдзельнікам Алімпійскіх гульняў капітанам футбольнай і хакейнай каманд. Але шматлікія траўмы прымусілі Баброва зрабіць канчатковы выбар на карысць хакея з шайбай, і ў 1953 годзе ён цалкам перайшоў на лядовае поле, дзе дабіўся яшчэ большых перамог.

**1930** год — нарадзіўся Ігар Рыгоравіч Жакаў, беларускі вучоны ў галіне анкалогіі і прамянёвай тэрапіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар. У 1982–1990 гадах працаваў дырэктарам НДІ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі ў Мінску. У 1992–1995-м — галоўны радыёлаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі. Аўтар навуковых прац па дыягностыцы і лячэнні злаякасных пухлін, распрацоўцы новых метадаў прамянёвай тэрапіі і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Было сказана

**Аляксей ПЫСІН, паэт:**
*«Відаць, там шчасце не канчаецца, дзе ёсць прычыны для трывог».*

### НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў СНЕЖНІ

2, серада, 5.00 – 12.00
4, пятніца, 7.00 – 23.30
7, панядзелак, 4.00 – 13.30
9, серада, 8.30 – 23.00
10, чацвер, 2.30 – 5.30
11, пятніца, 12.30 – 24.00
12, субота, 0.00 – 9.00
13, нядзеля, 19.00 – 23.00
14, панядзелак, 0.00 – 14.00
16, серада, 9.30 – 19.30
18, пятніца, 17.00 – 23.30
20, нядзеля, 22.30 – 24.00
22, аўторак, 16.30 – 24.00
23, серада, 0.00 – 4.30
24, чацвер, 16.00 – 24.00
25, пятніца, 0.00 – 7.30
27, нядзеля, 11.30 – 13.30
29, аўторак, 19.30 – 22.00

■ Будзь у курсе!

### НА СВЯТЫ — ДАДАТКОВЫЯ ЦЯГНІКІ

**Беларуская чыгунка прызначыла дадатковыя цягнікі ў калядныя і навагоднія святы.**

Яны будуць курсіраваць 24-25 і 30-31 снежня па маршрутах: Мінск — Брэст — Мінск і Мінск — Гомель — Мінск. Таксама цягнікі звяжуць сталіцу з Віцебскам, Гроднам, Пінскам і Полацкам. У міжнародных зносінах будуць прызначаны саставы па маршруце Брэст — Масква — Брэст адпраўленнем з Брэста 28 і 31 снежня, а таксама 1-2 студзеня. Плануецца прызначыць дадатковыя цягнікі па маршрутах Мінск — Санкт-Пецярбург — Мінск і Мінск — Масква — Мінск.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### УСМІХНЕМСЯ

Сустрэліся дзве сяброўкі:
— Дарагая, нешта ты папаўнела!
— Гэта я яшчэ пахудзела! Ты мяне месяц таму не бачыла — была, як ты!

**Я хацеў бы, каб мая жонка працавала ў якой-небудзь сакрэтнай службе. Тады б яна не мела права расказваць дома, што ў іх было сёння на працы.**

— Усе свае збераженні трачу на падарожжы.
— Што, зноў маршрутка падаражэла?

**Марына пасля тыднёвай дыеты скінула... шалі з пятага паверха.**

Урач выпісвае рэцэпт пацыенту і дае наказ:
— Дзесяць дзён не піць!
Потым глядзіць на яго твар, ірве рэцэпт і кажа:
— Добра, пасля Новага года зойдзеш.

**Хто займаецца спортам, жыве, па статыстыцы, у сярэднім на 5 гадоў даўжэй. Але пры гэтым марнуе 8 гадоў свайго жыцця на занятк і спортам.**




Малюнак Міколы ГРГЕЛЯ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4665.
Нумар падпісаны ў 19.30 30 лістапада 2015 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12